какняжацкую ўладу. Я. — родапачынальнік князёў *Заслаўскіх*.

*Літ.*: Грыцкевіч А. Яўнут (Іван) // Скрыжалі «Спадчыны». Мн., 1996. Вып. 2; Ермаловіч М. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. Мн., 2000; Stadnicki K. Synowie Gedymina wielkowładcy Litwy: Monwid—Narymunt—Jewnuta—Koriat. [3 wyd.] Lwow, 1881; Яго ж. Olgierd i Kiejstut, synowie Gedymina, w. księcia Litwy. Lwów, 1870. *Анатоль Грыцкевіч.*

**ЯЎРЭ́І** (саманазва йегудзім — на іўрыце, ідн — на ідыш), этнічная супольнасць, якая пражывае дысперсна ў многіх краінах свету, складаецца з розных субэтнічных груп (ашкеназы, сефарды, бухарскія Я. і інш.), мае адзіную этнічную свядомасць і аб'яднана агульным паходжаннем ад стараж. іудзеяў (выхадцаў з б. Ізраільска-Іудзейскага царства). Асн. насельніцтва Дзяржавы Ізраіль; пашыраны ў Амерыцы, Еўропе, Аўстраліі, на Блізкім і Сярэднім Усходзе і інш. Гавораць на іўрыце — мове семіцкай групы (у Ізраілі) і на інш. мовах свету (у дыяспары). Вернікі спавядаюць *іудаізм*. У Рэспубліцы Беларусь 27 810 чал. (перапіс 1999).

Рассеянне яўр. народа са сваёй гіст. радзімы пачалося са стараж. часоў. Пасля паражэння паўстання 132—135 н.э. супраць Рыма Я. былі прымусова выселены з Палесціны. У 10—13 ст. Я. з Крыма (не выключана, што разам з *хазарамі*, якія спавядалі іудаізм) сталі рассяляцца па стараж.-рус. княствах. Тут яны сфарміраваліся ў асобную славянамоўную субэтнічную групу — кенаанітаў. Верагодна, у гэты час Я.-кенааніты з'явіліся і на тэр. сучаснай паўд.-зах. Беларусі (іх абшчына ў Брэсце вядома да пач. 17 ст.). У 14—15 ст. на тэр. ВКЛ стала рассяляцца больш шматлікая субэтнічная група Я. — ашкеназы з Германіі (ад Ашкеназ — Германія), якія размаўлялі на нямецка-яўр. мове ідыш (іўрыт ва ўсіх Я. свету захоўваўся як культавая мова) і да 17—18 ст. цалкам асімілявалі Я.-кенаанітаў. На тэр. Беларусі і Літвы мясц. ашкеназы склалі асобую этнаграфічную групу — *літвакоў*. Першая пісьмовая крыніца аб Я. на землях Беларусі — грамата князя гродзенскага і трокскага Вітаўта 1388 брэсцкім Я. Яна рэгулявала парадак разгляду судовых спраў паміж хрысціянамі і Я., а таксама паміж самімі Я. У 1389 Вітаўт выдаў прывілей Я. Гродна, паводле якога вызначаліся межы пасяленняў Гродзенскай яўр. абшчыны, ім дазвалялася займацца гандлем, рамёствамі і інш., сінагогі і могілкі вызваляліся ад падаткаў. Да 1495 на тэр. Беларусі вядомы 2 гарады з аселым яўр. насельніцтвам: Брэст і Гродна. У крас. 1495 вял. кн. Аляксандр выдаў указ аб выгнанні з ВКЛ усіх Я., але ў сак. 1503 дазволіў вярнуцца гродзенскім, а ў крас. 1504 — усім астатнім Я. У 16 ст. перасяленне Я. у ВКЛ значна павялічылася; яно ішло праз Польшчу з Ніжняй Аўстрыі, Брандэнбурга, Браўншвейга, Італіі і Чэхіі. У 1560-я г. агульная колькасць Я. на тэр. ВКЛ дасягала 20 тыс. чал., а ў 1628 — каля 40 тыс. У гарадах





Яўрэі Беларусі. 2-я пал. 19 ст. Фота з фондаў Беларускага музея гісторыі рэлігіі. Гродна.

і мястэчках Я. складалі ад 2 да 10% насельніцтва. Пераважна гэта былі дробныя рамеснікі і гандляры; багатыя Я. (купцы, адкупшчыкі, ліхвяры) займалі высокае становішча ў грамадстве. У 16 ст. улады ВКЛ спрабавалі не дапусціць росту ўплыву яўр. вярхоў і абмежаваць іх правы. Статут ВКЛ 1529 забараняў Я. («жыдам»; разглядалася як асобнае саслоўе) мець закупаў і нявольнікаў. Паводле Статутаў ВКЛ 1566 і 1588 Я. не мелі права займаць дзярж. пасады, валодаць прыгоннымі сялянамі і халопамі (хрысціянамі), наймаць хрысціянак-карміцелек, быць сведкамі ў спрэчках з хрысціянамі. Разам з тым закон абараняў Я. ад сваволства хрысціян. Усе абмежаванні тычыліся Я.-іудзеяў, а калі Я. прымалі хрысціянства, то яны і іх нашчадкі маглі быць залічаны ў *шляхту*. У 16 ст. афармілася абшчынная форма яўр. самакіравання — *кагал*, што ізалявала Я. ад карэннага насельніцтва. Вышэйшым іх органам былі ваады — з'езды рабінаў і кагальных прадстаўнікоў. У 1623—1764 вышэйшым органам Я. ВКЛ быў *Літоўскі ваад*.

Незадавальненне сялян і гар. нізоў багатымі Я. — адкупшчыкамі, арандатарамі, кіраўнікамі маёнткаў, ліхвярамі, узмоцненае рэліг. адчужэннем, прыводзіла ў час паўстанняў і войнаў да трагічных наступстваў для ўсяго яўр. насельніцтва, асабліва ў час *антыфеадальнай вайны 1648—51* і *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67*. У 1788 у ВКЛ было 157 200 Я. Пастановы соймаў 1764 і 1768 скасавалі шэраг ранейшых прывілеяў Я. (у т.л. права набываць шляхецтва) і ўвялі абмежавальныя меры па пытаннях рамёстваў, гандлю і інш.

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) Я. гэтых тэрыторый былі аб'яўлены рас. падданымі і залічаны ў агульнадзярж. саслоўі, пераважна да мяшчан. У 1791—94 зах. губерні (у т.л. ўсе беларускія) былі ўключаны ў *мяжу яўрэйскай аселасці*. *Мястэчка* (на ідыш «штэтл») стала асн. тыпам паселішча Я. ва Усх. Еўропе. У 1851 усё яўр. насельніцтва было падзелена на 5 разрадаў: купцы, земляробы, рамеснікі, мяшчане аселыя і мяшчане неаселыя. У 1882 Аляксандр III падпісаў закон, які забараняў Я. жыць па-за межамі гарадоў і мястэчак, купляць і арандаваць зямлю. Я. не прымалі на работу ў дзярж. ўстановы, на афіцэрскія пасады ў армію, на чыг. транспарт. Дзейнічала норма прыёму Я. у сярэднія і вышэйшыя навуч. ўстановы. Я., у т.л. нац. буржуазія, у 1880-я г. былі фактычна пазбаўлены права ўдзелу ў выбарах органаў гар. самакіравання. Усе абмежаванні Я. у Рас. імперыі (як і ў Рэчы Паспалітай) мелі рэліг. аснову і не тычыліся Я., якія прымалі хрысціянства.

Разам з тым дзякуючы фінансаванню з боку яўр. вярхоў у канцы 18—19 ст. паспяхова развівалася яўр. культура і адукацыя. У 1783 у Шклове, а ў 1788 у Гродне былі створаны першыя на Беларусі яўр. друкарні (выдавалі *Біблію, Талмуд* і інш.), у 19 ст. пашырылася сетка *хедараў* і *ешываў*. З Беларусі паходзілі філосаф С.*Майман*, гісторыкі А.Я.Гаркаві і С.М.*Дубноў*. У мяст. Капыль нарадзіўся *Мэндэле Мойхер-Сфорым*, адзін з пачынальнікаў новай яўр. л-ры. У 1847 з мэтай пашырэння рус. культуры сярод Я. царскія ўлады пачалі ствараць казённыя яўр. вучылішчы з выкладаннем шэрагу (а потым і большасці) прадметаў на рус. мове. У канцы 19 ст. ў Ві-

*ленскай навучальнай акрузе* было 79 такіх вучылішчаў. Развіццё адукацыі на рус. мове прывяло да з'яўлення ў 2-й пал. 19 ст. яўр. рускамоўнай інтэлігенцыі. У 1881—1906 для яе выдаваўся ў Пецярбургу час. «Восход» (змяшчаў шмат матэрыялаў пра бел. Я.). Выдаваліся газеты і на мове ідыш, якой карысталася на той час абсалютная большасць Я. Беларусі.

Паводле перапісу 1897 у 5 бел. губернях было 1 202 129 Я. (14,1% усяго насельніцтва і 35,9% гар. насельніцтва *Паўн. Зах. краю*). У прамысловасці яны складалі 56,5% ад усяго самадзейнага насельніцтва, у гандлі — 88,6%. Вял. масу складала бедната: ад 25% да 38% Я. у шэрагу гарадоў і мястэчак жыло за кошт дабрачыннасці. Многія эмігрыравалі ў ЗША, Палесціну і інш. У той жа час гандлёва-прамысл. буржуазія ў краі была пераважна яўрэйскай. Паводле гэтага перапісу 84,5% купцоў 5 зах. губерняў складалі Я. (беларусаў было 1,7%). Я. з'яўляліся ўласнікамі 51% фабрык і заводаў (напр., яўр. капіталу належала адно з буйнейшых на Беларусі акц. т-ва «*Шарашэўскі*»). Пісьменных сярод Я., паводле перапісу, было 49% сярод мужчын і 28,2% сярод жанчын (у сярэднім па Рас. імперыі пісьменных было 28,4% сярод мужчын і жанчын разам).

У пач. 20 ст. Я. былі членамі агульнарас. паліт. партый шырокага спектра — ад кадэтаў да бальшавікоў. Былі створаны і нац. яўр. партыі: *Бунд, Сацыялістычная яўрэйская рабочая партыя, Саюз дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі* і інш., пашырыліся сіяністцкія гурткі і партыі (гл. *Сіянізм*). Я. Беларусі актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07. Лют. рэвалюцыя 1917 скасавала мяжу аселасці і абвясціла нац. раўнапраўе. Я. сталі вылучаць сваіх прадстаўнікоў у органы ўлады. Так, старшынёй гар. думы Мінска стаў адзін з кіраўнікоў Бунда А.Вайнштэйн, мінскі сіяніст Ю.Бруцкус абраны дэпутатам Устаноўчага сходу.

Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 раўнапраўе грамадзян усіх нацыянальнасцей краіны, у т.л. Я., было замацавана законам. Многія Я. актыўна ўдзельнічалі ва ўсталяванні сав. улады. У 1921 спец. дэкрэтам ЦВК БССР мове ідыш быў нададзены статус дзяржаўнай разам з бел., рус. і польскай. У жн. 1922 сярод членаў ЦВК БССР з 57 чал. Я. было 17 (беларусаў 19), сярод 13 членаў Цэнтральнага Бюро КП(б)Б Я. было 6 (беларусаў 5). З развіццём працэсаў *беларусізацыі* і *каранізацыі* доля яўр. кіруючых кадраў паменшала, але заставалася значнай і ў 1930-я г. Паводле перапісу 1926 у БССР пражывала 407 тыс. Я. (8,2% насельніцтва рэспублікі). У ходзе нац.-дзярж. будаўніцтва нацыянальных меншасцей Беларусі былі створаны яўр. *нацыянальныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі* — вядома 19 мястэчковых і 3 сельскія Саветы. У 1931 у БССР было 10 судоў, якія вялі справы на мове ідыш. У 1920—30 дзейнічала *Яўрэйскае бюро пры ЦК КП(б)Б*, былі створаны яўр. секцыі пры СНК БССР, Наркамаце асветы і інш. У 1920-я г. зроблена спроба далучыць Я. да сельскай гаспадаркі. Праз спец. камісію «Комзет» і «Беларускае таварыства садзейнічання зямельнаму ўладкаванню працоўных яўрэяў», створаныя ЦВК БССР, у 1924—26 зямлю атрымалі больш за 1500 яўр. сем'яў, былі таксама арганізаваны перасяленні яўр. земляробаў у Крым і Яўр. аўтаномную вобл. на Д. Усходзе (з 1934). У 1928 на 2-м з'ездзе яўр. сялян БССР канстатавалася, што створана 170 яўр. с.-г. кааператываў (дзейнічалі да Вял. Айч. вайны, але пасля вайны не адрадзіліся). У 1920—30-я г. актыўна развіваліся яўр. адукацыя і культура. У 1926—27 навуч. г. у БССР было 147 пачатковых і 53 сямігадовыя яўр. школы з навучаннем на мове ідыш, якая была прызнана адзінай мовай Я. Беларусі. Дзейнічалі яўр. дзіцячыя сады, 3 яўр. педтэхнікумы (у Мінску, Віцебску, Гомелі), аддзяленні і секцыі ў тэхнікумах і ВНУ. У 1932—35 працаваў Ін-т яўр. пралет. культуры (на базе заснаванага ў 1924 Яўр. аддзялення Інбелкульта). У 1926 у Мінску створаны Дзярж. яўр. тэатр БССР, а ў 1929 — яўр. харавая студыя. У БССР выдаваліся яўр. час. «*Штэрн*», двухтыднёвы час. «Дэр юнгер арбетэр» («Малады рабочы»), штодзённая газ. «Октобэр» («Кастрычнік»), піянерская газ. «Дэр юнгер ленінец» («Юны ленінец»). У 1929 выдадзена 55 назваў кніг на ідыш. Яўр. секцыя пры Саюзе пісьменнікаў БССР налічвала больш за 40 членаў. Найб. вядомымі сярод іх былі І.Харык, З.Аксельрод, М.Кульбак. Яўр. культура Беларусі дала свету такіх вядомых мастакоў, як З.*Азгур*, М.*Шагал*, Я.*Кругер*, Х.Суцін, С.Юдовін, Ю.*Пэн*, М.Аксельрод. У канцы 1930-х г. развіццё культуры і адукацыі Я. Беларусі, як і інш. нац. меншасцей, было згорнута. Частка прадстаўнікоў яўр. інтэлігенцыі з пач. 1920-х г. працавала ў рэчышчы бел. культуры (напр., З.*Бядуля*). Пераход яўр. мас на бел. а потым і рус. мову, вял. колькасць мяшаных шлюбаў, міграцыя бел. Я. у буйныя гарады Расіі з пач. 1920-х г. былі натуральнымі працэсамі культ. асіміляцыі нешматлікіх народаў, рассеяных сярод карэннага насельніцтва. У Я. Зах. Беларусі ў складзе Польшчы да 1939 захоўваліся традыц. формы самаарганізацыі, дзейнічалі яўр. паліт. партыі Бунд, *Паалей Цыён*, «Аб'яднанне яўр. жанчын» і інш. У той жа час Я. ў Польшчы фактычна цярпелі нераўнапраўе. Паводле перапісу ў студз. 1939 у БССР пражывала 375 тыс. Я. Пасля аб'яднання БССР з Зах. Беларуссю іх колькасць значна павялічылася. У час Вял. Айч. вайны на акупіраванай тэр. Беларусі Я. падвергліся генацыду з боку ням.-фаш. захопнікаў. Многія жыхары Беларусі — беларусы, рускія, палякі хавалі Я. ад нацыстаў і калабарацыяністаў. За выратаванне Я. ганаровага звання Ізраіля «Праведнік народаў свету» ўдастоены больш за 350 грамадзян Рэспублікі Беларусь. Шмат Я. ваявала на франтах у Чырв. Арміі, змагалася ў падполлі, партыз. руху. У канцы 1940 — пач. 1950-х г. у Беларусі (як увогуле ў СССР) была разгорнута кампанія суп-



Да арт. **Яўрэі**. Я.М.Кругер. Яўрэй-касец. 1929. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.





Да арт. **Яўрэі**. Выступленне тэатра яўрэйскай песні «Сімха» («Радасць») на адкрыцці Мінскага яўрэйскага абшчыннага дома. Красавік 2002.

раць «касмапалітаў», ад якой пацярпела і яўр. культура (гл. ў арт. *Антысемітызм*). У 1950-я — 1-й пал. 1980-х г. колькасць яўр. насельніцтва на Беларусі скарачалася як за кошт асіміляцыйных працэсаў, так і за кошт міграцый: у 1950 — 150 тыс., у 1970 — 148 тыс., у 1979 — 135 тыс., у 1989 — 112 тыс. У 1999 у Рэспубліцы Беларусь з 27 810 Я. (перапіс) толькі 1508 чал. назвалі роднай мову сваёй нацыянальнасці. У 1989—99 з Беларусі ў Ізраіль выехалі 64 127 чал., у 1989—94 у ЗША і інш. краіны — 21 127 чал. У 1988 у сувязі з працэсамі дэмакратызацыі ў СССР (гл. *Перабудова*) пачала адраджацца і яўр. культура Беларусі, пачалі ствараца грамадскія яўр. арг-цыі. Больш за 40 арг-цый у 26 гарадах Беларусі аб'ядноўвае Саюз беларускіх грамадскіх яўрэйскіх аб'яднанняў і абшчын (дзейнічае з 1991). Іўрыт вывучаецца ў СШ №132 г. Мінска, у больш чым 20 школах выхаднога дня для дзяцей і дарослых, у 4 дзіцячых садах. Праводзяцца навукова-практычныя канферэнцыі па яўр. тэматыцы. У Мінску з 1992 выдаецца рэсп. газ. «Авив» («Вясна»), у Віцебску з 1995 — альманах «Мишпоха» («Сям'я»), абодва на рус. мове. Яўр. калектывы маст. самадзейнасці (узорны тэатр. яўр. песні «Сімха» ў Мінску, нар. ансамбль яўр. музыкі «Шалом» у г. Ліда, яўр. муз. ансамбль «Блукаючыя зоркі» ў г. Полацк і інш.) займаюць высокія месцы на Усебел. фестывалях нац. культур. Наладжаны трывалыя сувязі Я. Беларусі з Ізраілем.

*Літ.*: Бершадский С.А. Литовские евреи. СПб., 1883; Оршанскнй И.Г. Евреи в России: Очерки и исслед. 2 нзд. СПб., 1877; История еврейского народа. Т. 11. История евреев в России. М., 1914; Розенблат Е. Жизнь и судьба Брестской еврейской общины XIV—XX вв. Брест, 1993; Скир А. Еврейская духовная культура в Беларуси. Мн., 1995; Иоффе Э.Г. Страницы истории евреев Беларуси. Мн., 1996; Евреи: По страницам истории / Сост. С.Асиновский, Э.Иоффе. Мн., 1997; Кузняева С. Еврейские общины Беларуси в конце XVIII — начале XX вв. Мн., 1998; Функ Ю.В. Евреи Беларуси в конце XIX — начале XX в. Мн., 1998; Иоффе Э., Мельцер Б. Джойнт в Беларуси. Мн., 1999; Смиловицкий Л. Евреи Беларуси: Из нащей общей истории, 1905—1953. Мн., 1999; Евреи Гродно: Очерки истории и культуры. Гродно, 2000; Солженицын А.И. Двести лет вместе (1795—1995). Ч. 1—2. М., 2001—02; Бядуля З. Жыды на Беларусі // Бел. шлях. 1918. 18, 22, 23 жн.; Евреи Беларуси: История и культура: Сб. статей. Вып. 1—6. Мн., 1997—2001; Анищенко Е. Евреи Белорусской губернии: Ист. очерк и док. Мн., 2002.

*Эмануіл Іофе.*

**ЯЎРЭ́ЙСКАЕ БЮРО́ ЦК КП(б)Б.** Існавала са жн. 1920 да лют. 1930. З 1924 наз. Гал. бюро яўр. секцыі. Кіравала дзейнасцю яўр. секцый пры мясц. арг-цыях КП(б)Б. Узначальваў бюро А.Р.Бейлін. Асн. задачы: вядзенне агітацыі і прапаганды сярод яўр. рабочых і беднаты, паліт. выхаванне членаў партыі з ліку яўр. насельніцтва, барацьба супраць уплыву яўр. буржуазіі і дробнабурж. груп на прац. масы з захаваннем нац. ідэалогіі і інш. Скасавана ў сувязі з зацвярджэннем 11.2.1930 сакратарыятам ЦК КП(б)Б новай структуры аддзелаў ЦК і акр. к-таў КП(б)Б. *Эмануіл Іофе*



У.Р.Яўсеенка.

**ЯЎРЭ́ЙСКАЯ КАМУНІСТЫ́ЧНАЯ ПАРТЫЯ** (ЯКП). Створана ў жн. 1919 на канферэнцыі ў Гомелі ў выніку расколу Яўр. с.-д. рабочай партыі. Левыя паалейцыяністы арганізавалі ЯКП і разам з падобнымі ёй партыямі ў жн. 1920 стварылі т.зв. Сусв. яўр. камуніст. саюз Паалей Цыён.

**ЯЎРЭ́ЙСКАЯ НЕЗАЛЕ́ЖНАЯ РАБО́ЧАЯ ПА́РТЫЯ** (ЯНРП), арганізацыя яўрэйскіх рамесных рабочых і прыказчыкаў. Засн. ў ліп. 1901 у Мінску прыхільнікамі «паліцэйскага сацыялізму» М.У.Вільбушэвіч, Ю.А.Воліным, А.Чамярыскім, Г.І.Шаевічам і інш. Мела аддзяленні ў Адэсе, Вільні, Гродне. Створана па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам нач. Маск. ахоўнага аддзялення С.В.Зубатава з мэтай барацьбы супраць сацыял-дэмакратаў, эсэраў і Бунда, за поўнае адмаўленне яўр. рабочых ад рэв. барацьбы супраць царызму. Члены ЯНРП разглядалі самадзяржаўе як надкласавую форму кіравання, арганізоўвалі культ. мерапрыемствы, касы ўзаемадапамогі, асв. клубы, лекцыі і інш. У канцы 1901 у ЯНРП перайшлі 15 з 20 цэхавых саюзаў *Мінскага сацыял-дэмакратычнага камітэта Бунда*. З дапамогай нач. Мінскага губ. жандарскага аддзялення палк. Васільева яны прымусілі прадпрымальнікаў слясарных майстэрняў Мінска ўвесці 12-гадзінны рабочы дзень. ЯНРП актыўна супрацоўнічала з сіяністамі ў барацьбе супраць рэв. партый і рухаў, выступала за ізаляцыю яўрэяў ад агульнарас. рабочага руху. Вясной 1903 у сувязі з уздымам паліт. рабочага руху царскі ўрад пачаў ліквідацыю легальных рабочых арг-цый, створаных Зубатавым. ЯНРП забаронена ў жн. 1903. Вільбушэвіч пераехала ў ЗША, потым у Палесціну, дзе была актыўным дзеячам сіяніцкага руху. Шаевіч пасля арганізацыі ў крас. 1903 забастоўкі на чыгуналіцейным з-дзе «Растэль» у Адэсе ў ліпені сасланы на 5 гадоў ва Усх. Сібір.

*Літ.*: Бухбиндер Н.А. Зубатовщина и рабочее движение в России. Мн., 1926; Бич М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861—1904 гг. Мн., 1983.

*Міхась Біч, Эдуард Ліпецкі.*

**ЯЎРЭ́ЙСКАЯ САЦЫЯ́Л-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ РАБО́ЧАЯ ПАРТЫЯ**, гл. ў арт. *Паалей Цыён.*

**ЯЎРЭ́ЙСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЯ РАБО́ЧАЯ ПА́РТЫЯ**, гл. *Сацыялістычная яўрэйская рабочая партыя.*

**ЯЎСЕЕ́НКА** Уладзімір Раманавіч (22.11.1922, в. Рынкаўка Чэрыкаўскага пав., цяпер Чэрыкаўскага р-на — 31.10.1978), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Іркуцкае авіятэхн. вучылішча (1942), Кіеўскае танк.-тэхн. вучылішча (1944), Томскі ун-т (1951). У Вял. Айч. вайну з лютага 1943 на фронце. Удзельнік вызвалення Украіны, Малдовы, Венгрыі, Румыніі. Механік-вадзіцель ст. сяржант Я. вызначыўся 24.8.1944 у баях за г. Бырлад (Румынія), дзе экіпаж яго танка з засады падбіў 3 гарматы і танк праціўніка; у баі за г. Бузэў удзельнічаў у захопе 3 эшалонаў з баявой тэхнікай, захапіў мост цераз р. Сірэт і ўтрымліваў яго да падыходу гал. сіл. Да 1961 на адм. рабоце.

**ЯФІ́МАК** (ад ням. Iaachimstallergulden), назва высакапробных *талераў* у рускамоўных крыніцах 17 ст. На Беларусь у час *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* траплялі «Я. з прыкметаю»: еўрапейскія *талеры* з маскоўскімі кантрамаркамі «Яздзец» «1655», якія афіцыйна былі ў абарачэнні да 1659 з прымусовым курсам.

*Літ.*: Спасский И.Г. Русские ефнмки: Исслед. и кат. Новосибирск, 1988.

*Іван Сінчук.*

**ЯФІ́МАЎ** Аляксандр Мікалаевіч (н. 6.2.1923, ст. Канцяміраўка, цяпер гар. пас. у Варонежскай вобл. Расія), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945). Канд. ваен. н. (1965). Засл. ваен. лётчык СССР (1970), маршал авіяцыі (1975). Скончыў Варашылаўградскую ваен. авіяшколу пілотаў (1942), акадэмії Ваенна-паветр. (1951) і Генштаба (1957). У Вял. Айч. вайну са жн. 1942 на Зах., 2-м Бел. франтах. Камандзір эскадрыллі, лётчык-знішчальнік ст. лейтэнант Я. вызначыўся ў час Бел. аперацыі 1944: вылятаў на разведку і штурмоўку варожых войск на р. Дняпро, Друць, Бярэзіна, у мінскім «катле». Да канца вайны зрабіў 222 баявыя вылеты. Пасля вайны на камандных пасадах, з 1969 1-ы нам. галоўнакамандуючага ВПС СССР. Дэп. ВС СССР у 1946—50, 1975—89. У г. Мілерава (Расія) бюст Я.